вых сувязей, усёй сістэмы зносін, пабудова якіх -- адна з асноўных задач бібліятэкі. Зносіны выступаюць у якасці трэцяга элемента складанай сістэмы.

Унутраны аб'ект -- бібліятэчная, бібліяграфічная і інфармацыйная дзейнасць у сістэме "дакумент -- спажывец", што ажыццяўляецца з дапамогаю непасрэдных альбо апасродкаваных зносін. Паколькі прадметам зносін ва ўмовах бібліятэкі з'яўляецца чытанне, альбо спажыванне дакумента ва ўсёй складанасці і шматбаковасці, бібліятэкару неабходна шырокая гуманітарная падрыхтоўка.

Бібліятэчная адукацыя пачыналася з пільнага вывучэння дакумента (кнігазнаўчы падыход). Вакол гэтага элемента склаўся цэлы шэраг дысцыплін -- агульнанавуковых, прафесійных і спецыяльных.

Вывучэнне другога, не менш важнага, элемента, мы маем на ўвазе чытача, адбываецца даволі фрагментарна і бессістэмна. Пытанні, звязаныя з чытачом, спажыўцом інфармацыі, распылены па розных курсах, а адзінага, комплекснага курса, накшталт "Дакументазнаўства", пакуль што няма. Настаў час сканцэнтраваць агульнанавуковыя і спецыяльныя пытанні, звязаныя з чытачом і спажыўцом інфармацыі, у адзіным комплексным курсе -- "Чытачазнаўства". Так можа быць вырашаны цэлы шэраг праблем міжпрадметнага характару.

Трэці элемент сістэмы -- бібліятэчныя зносіны. Яны сталі прадметам вывучэння і абмеркавання параўнальна нядаўна. У дадзенай галіне вельмі востра адчуваецца абмежаванасць тэарэтычных распрацовак. Але зараз назіраецца бурны рост колькасці публікацый на падставе даследаванняў, з'явіліся і першыя спробы тэарэтычнага асэнсавання праблемы. Спецкурс "Бібліятэчныя зносіны", які чытаецца для студэнтаў спецыялізацыі "Публічныя бібліятэкі", арганічна дапаўняе сістэму ведаў будучых бібліятэкараў, дазваляе фарміраваць у студэнтаў навыкі, неабходныя для эфектыўных зносін з чытачамі.

Такім чынам, найбольш дасканала ў сістэме падрыхтоўкі бібліятэкараў вызначана праблематыка, звязаная з элементам "дакумент". Існуе агульнанавуковы курс "Гісторыя кнігі" і агульнапрафесійны -- "Дакументазнаўства", а таксама шэраг галіновых бібліяграфій, у якіх дакумент выступае ў якасці аб'екта бібліяграфіравання.

Вывучэнне чытача як элемента знаходзіцца ў больш складаным становішчы. Асобныя пытанні разглядаюцца амаль што ў кожным спецыяльным курсе, а комплекснага курса, які даваў бы студэнтам фундаментальныя веды, пакуль што няма. На наш погляд, у сістэме падрыхтоўкі спецыяліста-бібліятэкара павінен быць агульнанавуковы курс, прысвечаны чытачу і чытанню, які адлюстроўваў бы пытанні сацыялогіі, псіхалогіі і педагогікі чытання і чытача. Далей аб'ект "чытач" вывучаецца больш канкрэтна як чытач бібліятэкі і спажывец бібліяграфічнай інфармацыі ў межах спецыяльных курсаў, такіх, напрыклад, як "Абслугоўванне чытачоў".

Вывучэнне унутранага аб'екта -- бібліятэчнабібліяграфічнай справы -- звязана з засваеннем бібліятэчнай тэхналогіі як у тэарэтычным плане, так і ў галіне падрыхтоўкі да практычнай дзейнасці. Важны ўплыў на ўдасканаленне навучання зрабіла дыскусія на старонках бібліятэчнага друку, прысвечаная ўзаемадзеянню і інтэграцыі бібліятэчных і бібліяграфічных працэсаў, якія разглядаліся як адзіны аб'ект. Але, вядома, адзіны аб'ект можа спалучаць у сабе розныя бакі і з'яўляцца прадметам розных навук. У бібліятэчнай практыцы прадметам з'яўляецца ўстанаўленне сувязі паміж кнігай і чытачом, у бібліяграфічнай -- паміж бібліяграфічнай інфармацыяй і яе спажыўцом. На справе гэта цэласны працэс, адзіны і непадзельны, таму што і першасны, і другасны змест узаемадзеяння (зносін) заключаны ў кнізе. Але, на жаль, навучальны працэс жорстка дыферэнцаваны.

Перспектывы інтэграцыі навучальнага працэсу звязаны з навуковым асэнсаваннем аб'ектыўнай структуры і прадмета дзейнасці, з пашырэннем міжпрадметных сувязей і сувязей паміж кафедрамі, паглыбленым вывучэннем тэхналогіі, перабудовай свядомасці выкладчыкаў.

Ляйко Н.А.,
канд.гіст.навук,
дацэнт
Фядорына А.І.,
ст.выкладчык

## ПРАБЛЕМЫ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА "АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЯ АПРАЦОЎКА ДАКУМЕНТАЎ"

Умовы рэфармавання вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва і беспера-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пынная адукацыя кадраў па еўрапейскіх стандартах патрабуюць удасканалення выкладання спецыяльных дысцыплін.

Асноўная задача вышэйшай школы на сучасным этапе -- забяспечыць падрыхтоўку спецыялістаў высокай кваліфікацыі, якія маюць адпаведную навуковую і практычную падрыхтоўку, дасканала валодаюць сваёй спецыяльнасцю і здольныя да творчай дзейнасці.

"Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў (бібліяграфічнае апісанне, індэксаванне)" - адзін з асноўных спецыяльных курсаў. На наш погляд, ён з'яўляецца фундаментам, які садзейнічае паспяховаму вывучэнню амаль што ўсіх дысцыплін бібліятэказнаўчага, бібліяграфазнаўчага і інфармацыйнага цыклаў.

У курсе разглядаюцца тэарэтычныя і метадычныя пытанні складання бібліяграфічнага апісання, сістэматызацыі і прадметызацыі, тэарэтычныя і практычныя асновы стварэння бібліятэчных каталогаў, іх арганізацыі, вядзення, рэдагавання.

"Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў (бібліяграфічнае апісанне, індэксаванне") - - гэта комплексны курс, які вывучае вышэйназваныя раздзелы ў тэхналагічным адзінстве, паслядоўнасці, пераемнасці, чаргаванні працэсаў.

На падставе авалодвання гэтымі працэсамі канчатковай мэтай курса з'яўляецца вывучэнне пытанняў стварэння, вызначэння якасці і эфектыўнасці выкарыстання чытачамі бібліятэчных каталогаў (як традыцыйных, так і нетрадыцыйных), якія з'яўляюцца часткай даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі.

У рамках вывучэння кожнага з працэсаў пытанні разглядаюцца ў трох аспектах: тэарэтычным, гістарычным і практычным.

Мэта курса -- тэарэтычна і практычна падрыхтаваць спецыялістаў у галіне каталагізацыі, даць дакладнае ўяўленне аб апрацоўцы дакументаў як цэласнай сістэме, якая вызначае асноўныя працэсы бібліяграфічнага апісання, сістэматызацыі і прадметызацыі. Менавіта з дапамогай іх чытач атрымлівае патрэбную інфармацыю аб кнігах, аб бібліяграфічных дадзеных.

Без ведання прынцыпаў і методыкі каталагізацыі немагчымы ні адзін з працэсаў прафесійнай работы з кнігай і іншымі відамі дакументаў. З дапамогай правільнай арганізацыі каталагізацыі ўдасканальваецца ўвогуле дзейнасць бібліятэкі.

Улічваючы гэта, а таксама супярэчнасці сучаснага перыяду (эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя), змены ў бібліяграфічным апісанні, асабліва розніцу ў сістэматызацыі і прадметызацыі дакументаў у бібліятэках розных тыпаў, наяўнасць значных змен у табліцах класіфікацыі і неабходнасць іх удасканалення, мэтазгодна, каб асноўны курс дапаўняўся адпаведнымі спецыяльнымі курсамі з улікам спецыялізацыі. Так, студэнты спецыялізацый "механізацыя і аўтаматызацыя бібліятэчных працэсаў", "бібліятэказнаўства і бібліяграфія тэхнічнай літаратуры" павінны больш падрабязна вывучаць табліцы УДК і займацца сістэматызацыяй тэхнічнай літаратуры ў спецкурсе "Сістэматызацыя тэхнічнай літаратуры", а студэнтам спецыялізацыі "бібліятэказнаўства і бібліяграфія дзіцячай літаратуры" мэтазгодна дэталёва вывучаць табліцы ББК для дзіцячых і школьных бібліятэк, знаёміцца з асаблівасцямі сістэматызацыі літаратуры для дзяцей розных узроставых груп і навучыцца арганізоўваць адпаведныя сістэматычныя каталогі з улікам гэтага ў курсе "Сістэматызацыя дзіцячай літаратуры і арганізацыя сістэматычнага каталога для дзяцей".

У сувязі з тым, што на сучасным этапе ажыццяўляецца рэарганізацыя масавых бібліятэк і ў многіх з іх пачалі працаваць аддзелы, якія абслугоўваюць чытачоў-дзяцей і падлеткаў, мэтазгодна было б, каб і для студэнтаў спецыялізацыі "публічныя бібліятэкі" выкладаўся гэты спецкурс.

Асаблівую ўвагу пры падрыхтоўцы студэнтаў спецыялізацыі "публічныя бібліятэкі" трэба звярнуць на выкладанне курса "Сістэматызацыя мастацкай літаратуры і літаратуры па мастацтву". Гэта тлумачыцца тым, што ва ўсёй рабоце публічных бібліятэк адбываюцца значныя змены, пачынаючы з камплектавання і канчаючы масавымі мерапрыемствамі. За апошні час бібліятэкі значна папоўніліся нотнымі выданнямі і аўдыёвізуальнымі матэрыяламі. Фонд мастацкай літаратуры ў публічных бібліятэках РБ складае каля 60% ад агульнай колькасці. Акрамя таго, значныя змены ўнесены таксама ў аддзелы мастацкай літаратуры і літаратуры па мастацтву ў табліцах класіфікацыі, у публічных бібліятэках арганізуюцца каталогі нотных выданняў і гуказапісаў.

Безумоўна, названыя вышэй напрамкі выкладання курса не з'яўляюцца вычарпальнымі.

Пераход на пяцігадовую сістэму падрыхтоўкі кадраў прадугледжвае шырокае выкарыстанне камп'ютэрных тэхналогій у навучанні і выхаван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ні студэнтаў як звычайную норму нашай работы, як неабходны элемент навучальнага працэсу. Калі мы не здолеем гэтага дасягнуць, то не здолеем і выйсці на сучасны ўзровень вышэйшай бібліятэчнай адукацыі.

Мы згодны, што традыцыйныя формы і метады прадстаўлення інфармацыі, увесь тэхналагічны працэс яе апрацоўкі ў бібліятэках патрабуюць перагляду, пераводу сістэмы каталогаў на новы тэхналагічны рэжым, стварэння электронных каталогаў з выкарыстаннем ЭВМ. Менавіта таму ў Беларускім універсітэце культуры неабходна вучыць студэнтаў аўтаматызацыі бібліятэчных тэхналагічных працэсаў.

Ва ўмовах рэфармавання навучання і бесперапыннай адукацыі кадраў па еўрапейскіх стандартах асаблівую ўвагу нам трэба звярнуць на міжпрадметныя сувязі курсаў "Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў", "Інфарматыка", "Вылічальная тэхніка". Для таго, каб на лабараторных занятках па арганізацыі каталогаў кожны студэнт мог карыстацца камп'ютэрам як сродкам навучання, мэтазгодна курс "Вылічальная тэхніка" выкладаць раней курса "Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў", а курс "Інфарматыка" -- паралельна з першым. Гэта дасць магчымасць студэнтам эфектыўна выкарыстоўваць неабходныя праграмныя сродкі, быць сапраўднымі карыстальнікамі вылічальнай тэхнікі.

Ва ўмовах рэфармавання вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва асаблівую ўвагу трэба звярнуць на праграмы, падручнікі, вучэбныя і метадычныя дапаможнікі. Па курсу "Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў" складзены праграмы для Беларускага універсітэта культуры і каледжа, дзе прадугледжваецца ўлік шматузроўневай сістэмы адукацыі. Акрамя таго, у 1994 г. выйдуць з друку дапрацаваныя і перакладзеныя на беларускую мову табліцы бібліятэчна-бібліяграфічнай класіфікацыі для дзіцячых і школьных бібліятэк і вучэбны дапаможнік "Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў".

На наш погляд, пры пераходзе да шматузроўневай сістэмы адукацыі асаблівую ўвагу трэба звярнуць таксама на вучэбныя планы. Калі будзе ажыццяўляцца падрыхтоўка па асобных вучэбных планах са скарочаным тэрмінам навучання ў Беларускім універсітэце культуры, неабходна, каб падрыхтоўка ў Мінскім каледжы і Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме па спецыяльных дысцыплінах была аднолькавай.

Саітава В.І.,
канд.пед.навук,
дацэнт

# МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ КУРСА "ГІСТОРЫЯ СУСВЕТНАЙ БІБЛІЯГРАФІІ"

Курс "Гісторыя сусветнай бібліяграфіі" быў уведзены ў працэсе перабудовы выкладання бібліяграфічных дысцыплін пад уплывам глыбокіх унутраных і знешніх змен у сацыяльна-палітычным жыцці краіны. У канцэпцыю новага курса закладзены ідэі гуманітарызацыі зместу, дэідэалагізацыі, параўнальнага аналізу. Ставілася задача аб'ектыўна раскрыць развіццё бібліяграфіі, яе ролю ў агульначалавечай культуры, далучыць студэнтаў да лепшых дасягненняў у гэтай галіне. Увядзенне курса "Гісторыя сусветнай бібліяграфіі" сведчыць аб зацікаўленасці факультэта ў павышэнні грунтоўнасці выкладання бібліяграфічных дысцыплін.

Курс "Гісторыя сусветнай бібліяграфіі" спалучае ў сабе два галоўных накірункі: развіццё бібліяграфічнай дзейнасці і азнаямленне з капітальнымі бібліяграфічнымі крыніцамі мінулага, якія паспяхова выкарыстоўваюцца сёння ў мэтах бібліяграфічнага пошуку. Такая асаблівасць зместу дысцыпліны абумовіла яе шырокія сувязі з іншымі бібліяграфічнымі і небібліяграфічнымі дысцыплінамі.

З паралельна чытаемых у трэцім семестры курсаў "Гісторыя сусветнай бібліяграфіі" і "Тэорыя бібліяграфіі" студэнты пачынаюць вывучэнне бібліяграфічных дысцыплін. Такі падыход метадалагічна абгрунтаваны, таму што тэорыя і гісторыя даюць цэласнае ўяўленне аб бібліяграфіі і ў значнай ступені садзейнічаюць фарміраванню прафесійнага светапогляду бібліятэкараў-бібліёграфаў. Нягледзячы на істотную розніцу ў гэтых дысцыплінах, гісторыя сусветнай бібліяграфіі дапаўняе тэорыю, даючы студэнтам канкрэтна-гістарычнае ўяўленне аб развіцці аб'ектаў, суб'ектаў і іншых састаўляючых кампанентнай і відавай структуры бібліяграфіі. У названым курсе асвятляюцца дасягненні тэорыі на розных этапах, асноўныя канцэпцыі бібліяграфіі ў мінулым.

Непасрэдна працягвае і дапаўняе курс "Гісторыя сусветнай бібліяграфіі" курс "Гісторыя беларускай бібліяграфіі". Існаванне паасобных

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ